# РЭКАМЕНДАЦЫІ
# ПА ВЫНІКАХ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ КАНТРОЛЬНАЙ РАБОТЫ ПА ВУЧЭБНЫМ ПРАДМЕЦЕ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА» (Х КЛАС) у 2018/2019 вучэбным годзе

Рэспубліканская кантрольная работа (далей — РКР) па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» праводзілася ў адпаведнасці з загадам[1] Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь з мэтай вывучэння ўзроўню адукацыйных вынікаў навучэнцаў Х класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

Змест кантрольнай работы адпавядаў зместу і патрабаванням вучэбнай праграмы па вучэбным прадмеце «Беларуская мова»[2] для базавага ўзроўню вывучэння вучэбнага прадмета.

Вывучэнне фактараў, якія маглі б аказаць уздзеянне на засваенне зместу адукацыі па вучэбным прадмеце, ажыццяўлялася шляхам анкетавання навучэнцаў Х класаў і настаўнікаў-прадметнікаў, якія працуюць у гэтых класах.

Вынікі РКР з мэтай павышэння якасці адукацыі па вучэбным прадмеце могуць быць выкарыстаны настаўнікамі-прадметнікамі, спецыялістамі сістэмы павышэння кваліфікацыі, кіраўнікамі ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, структурнымі падраздзяленнямі абласных (Мінскага гарадскога) выканаўчых камітэтаў, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі.

## Характарыстыка дыягнастычнага інструментарыю.

Дыягнастычны інструментарый для правядзення рэспубліканскай кантрольнай работы па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» складзены з улікам аб'ёму вучэбнага матэрыялу, вывучанага навучэнцамі Х класа да даты правядзення РКР (у адпаведнасці з прыкладным каляндарна-тэматычным планаваннем, рэкамендаваным навукова-метадычнай установай «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь[3]).

Правяраемы ў ходзе РКР вучэбны матэрыял прадстаўлены ў табліцы 1.

На выкананне кантрольнай работы адводзілася 45 хвілін.

Кожны з чатырох варыянтаў кантрольнай работы ўключаў:

- 10 рознаўзроўневых заданняў (I узровень — заданні № 1, 2; II узровень — № 3, 4; III узровень — № 5, 6; IV узровень — № 7, 8; V узровень — № 9, 10);
- заданні рознага віду (два заданні з выбарам аднаго адказу з пяці прапанаваных варыянтаў; два заданні з выбарам двух правільных адказаў з пяці прапанаваных варыянтаў; два заданні на ўстанаўленне адпаведнасці паміж элементамі двух мностваў; два заданні з кароткім адказам; два заданні з разгорнутым адказам).

Пры выкананні задання № 10 неабходна было выкарыстаць веды і ўменні па розных раздзелах праграмы.

З мэтай азнаямлення ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу са структурай кантрольнай работы была распрацавана яе дэман-

---

[1] Загад № 695 ад 17.09.2018 «Об изучении качества общего среднего образования в 2018/2019 учебном году».

[2] Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для Х—ХІ класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання (базавы ўзровень): зацв. М-вам адукацыі Рэсп. Беларусь. — Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2017. — С. 3—10.

[3] Беларуская мова і літаратура: прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне. Х клас. — Мінск: НІА: Аверсэў, 2018. — 112 с.

**Табліца 1. — Вучэбны матэрыял, які правяраўся ў ходзе РКР па вучэбным прадмеце «Беларуская мова»**

| № п/п | Раздзел вучэбнай праграмы | Колькасць заданняў |
|---|---|---|
| 1 | Фанетыка і арфаэпія | 1 |
| 2 | Пунктуацыя | 1 |
| 3 | Лексіка. Фразеалогія | 1 |
| 4 | Арфаграфія | 1 |
| 5 | Тэкст | 1 |
| 6 | Марфемная будова слова | 1 |
| 7 | Маўленне | 1 |
| 8 | Словаўтварэнне | 1 |
| 9 | Культура маўлення | 1 |

страцыйная версія (са снежня 2018 года размешчана на інфармацыйным рэсурсе упраўлення маніторынгу якасці адукацыі НІА па адрасе: http://monitoring.adu.by).

### Вынікі выканання РКР навучэнцамі, якія вывучаюць вучэбны прадмет на базавым і павышаным узроўнях.

У РКР па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» прынялі ўдзел 4 385 навучэнцаў X класа са 170 устаноў агульнай сярэдняй адукацыі (з іх: 4 164 навучэнцы вывучаюць вучэбны прадмет на базавым узроўні, 221 — на павышаным узроўні).

Вынікі выканання РКР навучэнцамі X класа, якія вывучаюць вучэбны прадмет на базавым **(Б)** і павышаным **(П)** узроўнях, прадстаўлены ў дыяграме.

Вынікі выканання кантрольнай работы, прадстаўленыя ў дыяграме, дазваляюць канстатаваць наступнае.

1) Сярод удзельнікаў РКР на *высокім, дастатковым і сярэднім узроўнях* (адзнакі «5—10 балаў») выканалі кантрольную работу:

— 90,2 % вучняў, якія вывучаюць вучэбны прадмет на **базавым узроўні.** Сярод іх: большасць навучэнцаў (85,9 %) выканалі РКР на *дастатковым і сярэднім узроўнях* (50,8 % навучэнцаў атрымалі адзнакі «7—8 балаў»; 35,1 % — адзнакі «5—6 балаў»); 4,3 % навучэнцаў выканалі кантрольную работу на *высокім узроўні* (адзнакі «9—10 балаў»);

— 96,8 % вучняў, якія вывучаюць вучэбны прадмет на **павышаным узроўні.** Сярод іх: большасць навучэнцаў (90,9 %) выканалі РКР на *дастатковым і сярэднім узроўнях* (58,8 % навучэнцаў атрымалі адзнакі «7—8 балаў»; 32,1 % — адзнакі «5—6 балаў»); 5,9 % навучэнцаў выканалі кантрольную работу на *высокім узроўні* (адзнакі «9—10 балаў»);

2) на *здавальняючым і нізкім узроўнях* (адзнакі «1—4 бала») кантрольную работу выканалі 9,8 % вучняў, якія вывучаюць вучэбны прадмет на базавым узроўні. Сярод іх 9,6 % навучэнцаў атрымалі адзнакі «3—4 бала»; 0,2 % — адзнакі «1—2 бала».

Сярод вучняў, якія вывучаюць вучэбны прадмет на павышаным узроўні, 3,2 % вучняў атрымалі адзнакі «3—4 бала».

### Якасны аналіз вынікаў выканання кантрольнай работы.

Найбольш паспяхова ўдзельнікі РКР выканалі заданні I узроўню засваення вучэбнага матэрыялу, менш паспяхо-




| | Б | П | Б | П | Б | П | Б | П | Б | П |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Высокі ўзровень (адзнакі 9—10) | | Дастатковы ўзровень (адзнакі 7—8) | | Сярэдні ўзровень (адзнакі 5—6) | | Здавальняючы ўзровень (адзнакі 3—4) | | Нізкі ўзровень (адзнакі 1—2) | |
| Колькасць вучняў (у %) | 4,3 | 5,9 | 50,8 | 58,8 | 35,1 | 32,1 | 9,6 | 3,2 | 0,2 | 0 |

**Дыяграма. — Размеркаванне навучэнцаў, якія вывучаюць вучэбны прадмет на базавым і павышаным узроўнях, па ўзроўнях засваення вучэбнага матэрыялу (па выніках РКР), %**

ва — заданні іншых узроўняў. Вынікі выканання заданняў кантрольнай работы прадстаўлены ў табліцы 2.

**Заданне № 1** было накіравана на праверку засваення арфаэпічных норм беларускай мовы. Гэта заданне правільна выканалі 84,4 % навучэнцаў, 15,5 % навучэнцаў дапусцілі памылкі пры яго выкананні, 0,1 % — не прыступілі да выканання дадзенага задання.

Для выканання задання № 1 у кожным з чатырох варыянтаў былі прапанаваны словы з рознымі фанетычнымі асаблівасцямі (I варыянт — слова з фанетычнай з'явай «аглушэнне звонкага гука перад глухім», II варыянт — з фанетычнай з'явай «прыпадабненне свісцячага гука да шыпячага», III варыянт — «аглушэнне звонкага гука перад глухім», IV варыянт — «прыпадабненне гукаў па мяккасці»).

Правільна вызначылі фанетычную з'яву «аглушэнне звонкага гука перад глухім» (I варыянт) 88,3 % навучэнцаў, 11,6 % навучэнцаў дапусцілі памылкі пры яго выкананні, 0,1 % — не прыступілі да выканання дадзенага задання.

Вызначылі правільна фанетычную з'яву «прыпадабненне свісцячага гука да шыпячага» (II варыянт) 71,4 % навучэнцаў, 28,3 % навучэнцаў дапусцілі памылкі пры яго выкананні, 0,3 % — не прыступілі да выканання дадзенага задання.

Фанетычную з'яву «аглушэнне звонкага гука перад глухім» (III варыянт) правільна вызначылі 91,6 % навучэнцаў, 8,3 % навучэнцаў дапусцілі памылкі пры яго выкананні, 0,1 % — не прыступілі да выканання дадзенага задання.

Правільна вызначылі фанетычную з'яву «прыпадабненне гукаў па мяккасці» (IV варыянт) 86,7 % навучэнцаў, 13,3 % навучэнцаў дапусцілі памылкі пры выкананні задання.

**Заданне № 2** правярала засваенне вучнямі пунктуацыйных норм. У цэлым з заданнем справіліся 85,6 % навучэнцаў, 14,4 % — дапусцілі памылкі.

У заданні № 2 I варыянта патрэбна было выбраць знак прыпынку (двукроп'е) для пастаноўкі паміж часткамі ў бяззлучнікавым складаным сказе, II варыянта — знакі прыпынку (коску і працяжнік) для афарм-

**Табліца 2. — Вынікі выканання заданняў кантрольнай работы**

| Узровень засваення вучэбнага матэрыялу | Від заданняў | Нумар задання | Змест задання | Колькасць навучэнцаў, якія правільна выканалі заданне (%) |
|---|---|---|---|---|
| I | Выбар аднаго правільнага адказу з пяці прапанаваных | 1 | Вызначыць фанетычную з'яву, якая назіраецца ў прапанаваным слове | 84,4 |
| | | 2 | Вызначыць знак прыпынку, прапушчаны ва ўказаным сказе | 85,6 |
| II | Выбар двух правільных адказаў з пяці прапанаваных | 3 | Падабраць два словы-сінонімы да ўказанага слова з тэксту | 38,1 |
| | | 4 | Адзначыць два словы, напісанне якіх адпавядае ўказаным правілам арфаграфіі | 47,5 |
| III | Устанаўленне адпаведнасці паміж элементамі двух мностваў | 5 | Вызначыць, што адлюстроўваюць выразы (тэму, асноўную думку, падтэму) прапанаванага для аналізу тэксту | 32,0 |
| | | 6 | Устанавіць адпаведнасць паміж словамі і іх марфемнай будовай | 29,6 |
| IV | Кароткі пісьмовы адказ | 7 | Вызначыць і запісаць стыль і тып прапанаванага для аналізу тэксту | 2,5 |
| | | 8 | Утварыць ад прапанаванага слова ўказаным спосабам іншае слова (дзеяслоў), ад яго ўтварыць дзеепрыметнік з указанымі граматычнымі катэгорыямі, выкарыстоўваючы формаўтваральныя марфемы, якія з'яўляюцца паказчыкамі гэтых граматычных катэгорый | 19,6 |
| V | Разгорнуты пісьмовы адказ | 9 | Знайсці і выправіць у выказваннях маўленчыя памылкі, запісаць правільныя сказы | 8,0 |
| | | 10 | Скласці і запісаць тэкст (5—7 сказаў) на прапанаваную тэму пэўнага тыпу маўлення, даць загаловак | 3,0 |

лення сінтаксічнай канструкцыі з простай мовай, III варыянта — знак прыпынку (коску) для пастаноўкі паміж часткамі ў складаназалежным сказе, IV варыянта — знак прыпынку (коску) для адасаблення азначэння. Вынікі выканання задання № 2 прадстаўлены ў табліцы 3.

**Заданне № 3** было накіравана на праверку засваення лексічных норм сучаснай беларускай мовы. У заданні патрабавалася вызначыць два сінонімы з пяці прапанаваных слоў да выдзеленага ў тэксце слова. З заданнем справіліся 38,1 % навучэнцаў, памылкі дапусцілі 61,9 % навучэнцаў.

**Заданне № 4** правярала засваенне вучнямі арфаграфічных норм. Навучэнцам неабходна было адзначыць два словы з пяці прапанаваных, напісанне якіх адпавядае пэўным арфаграфічным правілам. Без памылак выканалі заданне 47,5 % навучэнцаў, 52,2 % навучэнцаў дапусцілі памылкі, 0,3 % — не прыступілі да выканання дадзенага задання.

У заданні № 4 для I варыянта патрэбна было вызначыць словы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс падоўжаных зычных», для II варыянта — правілам, якія падпарадкоўваюцца марфалагічнаму прынцыпу напісання — «Правапіс звонкіх зычных перад глухімі», «Правапіс прыставак на зычны», для III варыянта — «Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных

Табліца 3. — Вынікі выканання задання № 2

| Варыянт | Колькасць навучэнцаў (%) | | |
|---|---|---|---|
| | правільна выканалі заданне | няправільна выканалі заданне | не прыступілі да выканання задання |
| I | 80,1 | 19,9 | 0 |
| II | 83,3 | 16,6 | 0,1 |
| III | 85,5 | 14,5 | 0 |
| IV | 94,5 | 5,5 | 0 |

Табліца 4. — Вынікі выканання задання № 4

| Варыянт | Колькасць навучэнцаў (%) | | |
|---|---|---|---|
| | правільна выканалі заданне | няправільна выканалі заданне | не прыступілі да выканання задання |
| I | 59,0 | 40,9 | 0,1 |
| II | 35,8 | 63,3 | 0,9 |
| III | 59,6 | 40,2 | 0,2 |
| IV | 34,6 | 65,4 | 0 |

словах», для IV варыянта — «Правапіс прыстаўных зычных». Вынікі выканання задання № 4 прадстаўлены ў табліцы 4.

**Заданне № 5** было накіравана на праверку ўменняў вызначаць тэму, асноўную думку, падтэму тэксту. Заданне правільна выканалі 32,0 % навучэнцаў, дапусцілі памылкі 67,7 % навучэнцаў, не прыступілі да яго выканання 0,3 % навучэнцаў.

Для выканання **задання № 6** навучэнцам неабходна было ведаць марфемы і ўмець вызначаць іх у словах. Навучэнцам прапаноўвалася падабраць да трох слоў адпаведныя ім схематычныя запісы марфемнай будовы слова. Заданне без памылак выканалі 29,6 % навучэнцаў, дапусцілі памылкі 69,8 % навучэнцаў, не прыступілі да яго выканання 0,6 % навучэнцаў.

Для выканання **задання № 7** навучэнцам неабходна было ведаць функцыянальныя стылі маўлення і тыпы тэкстаў, умець вызначаць стыль і тып, да якіх належыць прапанаваны тэкст. Гэта заданне правільна выканалі 2,5 % навучэнцаў, 95,8 % навучэнцаў выканалі заданне з памылкамі, 1,7 % навучэнцаў да выканання дадзенага задання не прыступілі.

Пры вызначэнні функцыянальнага стылю, да якога належыць тэкст, дапусцілі памылкі 36,5 % навучэнцаў, не змаглі правільна вызначыць тып тэксту 64,5 % навучэнцаў.

Выконваючы заданне № 7, некаторыя навучэнцы дапусцілі таксама арфаграфічныя памылкі (на правапіс ***д*** і ***дз, т*** і ***ц,*** галосных ***е, ё, я,*** галосных ***о, э, а,*** падоўжаных зычных; некаторых спалучэнняў зычных), пунктуацыйныя памылкі, няправільна ўтварылі словы.

У ходзе выканання **задання № 8** навучэнцы павінны былі прадэманстраваць уменне ўтвараць новыя словы ад прапанаваных адпаведным спосабам, а таксама пры дапамозе формаўтваральных марфем формы слоў з зададзенымі граматычнымі катэгорыямі, паказчыкамі якіх з'яўляюцца адпаведныя марфемы. Заданне выканалі правільна 19,6 % навучэнцаў, 71,9 % — дапусцілі памылкі, 8,5 % навучэнцаў да выканання задання не прыступілі.

Пры гэтым неабходна адзначыць, што 78,0 % навучэнцаў дапусцілі памылкі пры ўтварэнні дзеяслова і/або яго форм, 10,6 % утварылі слова іншым спосабам; 0,4 % пры ўтварэнні форм дзеяслова выкарысталі марфемы, якія з'яўляюцца паказчыкамі іншых граматычных катэгорый. Утварылі словы, якія не адпавядалі прыведзенай у заданні фармулёўцы (з іншым лексічным значэннем), 1,8 % навучэнцаў.

Пры выкананні задання № 8 навучэнцы дапусцілі арфаграфічныя памылкі на правапіс падоўжаных зычных; галосных ***е, ё, я,*** галосных ***о, э, а, у*** і ***ў,*** некаторых спалучэнняў зычных, мяккага знака і апострафа.

З **заданнем № 9,** у якім патрэбна было знайсці ў сказах маўленчыя памылкі і запісаць сказы правільна, без памылак, справіліся 8,0 % навучэнцаў; 80,5 % навучэнцаў выканалі заданне з памылкамі, 11,5 % навучэнцаў не прыступілі да яго выканання.

Выконваючы заданне № 9, навучэнцы не змаглі правільна выправіць парушэнні норм беларускай літаратурнай мовы (81,8 %), вызначыць лексічнае значэнне слоў (7,8 %); дапусцілі памылкі, утвараючы новыя словы (1,3 %); дапусцілі арфаграфічныя памылкі (на правапіс ***у*** і ***ў*** (3,0%), прыставак, якія заканчваюцца на зычны (1,8 %), галосных ***о, э, а*** і галосных ***е, ё, я*** (па 1,4 %), некаторых спалучэнняў зычных (0,8 %), ***д*** і ***дз, т*** і ***ц*** (0,6 %), падоўжаных зычных (0,4 %); спалучэнняў галосных у запазычаных словах (0,3 %), правапіс вялікай і малой літар, слоў разам, праз злучок і асобна, ***і, ы, й*** пасля прыставак (па 0,2 %), мяккага знака і апострафа (0,1 %), прыстаўных галосных, прыстаўных і ўстаўных зычных (0,03 %)) і пунктуацыйныя памылкі (паводле правіл: знакі прыпынку ў канцы сказа (4,1 %); знакі прыпынку ў сказах з адасобленымі членамі сказа (0,6 %); знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі (0,2 %); працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам, знакі прыпынку ў сказах са звароткамі, знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназлучаных сказах (па 0,1 %)).

**Заданне № 10,** у якім патрэбна было запісаць тэкст на прапанаваную тэму пэўнага тыпу (тэкст-разважанне), правільна выканалі 3,0 % навучэнцаў; 69,6 % навучэнцаў дапусцілі памылкі, 27,4 % навучэнцаў да выканання гэтага задання не прыступілі.

Пісьмовыя тэксты навучэнцаў мелі наступныя недахопы ў змесце: не былі ўлічаны сфера выкарыстання, мэты, умовы зносін, адрасат, тып маўлення (47,8 % навучэнцаў); парушана сэнсавая сувязь частак тэксту, сказаў, адсутнічаў загаловак (14,6 %); не раскрыта тэма і/або асноўная думка (0,8 %).

Пры маўленчым афармленні ўласных тэкстаў навучэнцы ў недастатковай ступені выкарыстоўвалі стылістычныя магчымасці лексікі і фразеалогіі (29,3 %), ужывалі словы з іншым лексічным значэннем (2,6 %), няправільна падбіралі да слоў сінонімы, антонімы (1,0 %).

Ствараючы ўласныя пісьмовыя тэксты, навучэнцы дапусцілі арфаграфічныя памылкі на правапіс: ***у*** і ***ў*** (8,2 %), галосных ***о, э, а*** (5,6 %), галосных ***е, ё, я*** (4,9 %), слоў разам, праз злучок і асобна (3,3 %), мяккага знака і апострафа (3,1 %), падоўжаных зычных (2,43 %), вялікай і малой літар (2,4 %), ***д*** і ***дз, т*** і ***ц*** (2,36 %), прыставак, якія заканчваюцца на зычны (1,5%), некаторых спалучэнняў зычных (1,4 %), ***і, ы, й*** пасля прыставак, спалучэнняў галосных у запазычаных словах (па 0,4 %), прыстаўных галосных, прыстаўных і ўстаўных зычных (0,2 %).

Ва ўласных тэкстах навучэнцы дапусцілі памылкі на наступныя пунктуацыйныя правілы: знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназалежных сказах (13,8 %); знакі прыпынку пры пабочных словах, словазлучэннях і сказах (6,5 %); працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам (4,1 %); знакі прыпынку ў канцы сказа (3,6 %); знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі, знакі прыпынку ў сказах з адасобленымі членамі сказа (па 2,7 %); знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназлучаных сказах (2,2 %); знакі прыпынку ў канструкцыях з чужой мовай, пунктуацыйнае афармленне цытат (1,0 %); знакі прыпынку пры параўнальных зваротах (0,8 %); знакі прыпынку паміж часткамі ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі частак (0,5 %); знакі прыпынку ў сказах са звароткамі (0,2 %).

У тэкстах навучэнцаў адзначаны і няправільна ўтвораныя формы слоў (каля 6 %).

### Фактары, якія аказваюць уздзеянне на засваенне зместу адукацыі па вучэбным прадмеце «Беларуская мова».

Апытанне навучэнцаў — удзельнікаў РКР па вучэбным прадмеце «Беларуская

мова» — паказала, што кантрольную работу ацанілі як цяжкую для сябе 8,6 % з іх. Для большасці навучэнцаў (77,4 %) цяжкімі былі толькі некаторыя заданні кантрольнай работы. Каля 11,6 % апытаных адказалі, што кантрольная работа не выклікала ў іх цяжкасцей.

У якасці прычын, якія выклікаюць цяжкасці пры вывучэнні вучэбнага матэрыялу, навучэнцы ўказалі:

— уласныя ляноту і неарганізаванасць (45,3 %);

— цяжкасць вучэбнага прадмета (38,8 %);

— пропускі заняткаў і ненавёрстванне вучэбнага матэрыялу (20,5 %);

— хуткі тэмп вучэбных заняткаў (20,5 %);

— вялікі аб'ём вучэбнага матэрыялу, які адводзіцца для засваення на адных вучэбных занятках (20,5 %);

— цяжкую мову выкладу вучэбнага матэрыялу ў вучэбным дапаможніку (18,5 %);

— няўменне выдзяляць галоўнае ў тэксце (14,0 %).

У якасці прычын цяжкасцей таксама ўказваліся наступныя: «аб'ём дамашніх заданняў вельмі вялікі» (12,8 % адказаў), «перашкаджае шум у класе ў час вучэбных заняткаў» (9,8 %), «настаўнік не зусім зразумела тлумачыць вучэбны матэрыял» (6,1 %).

У большасці выпадкаў пры ўзнікненні цяжкасцей пры вывучэнні вучэбнага прадмета навучэнцы звяртаюцца па дапамогу да настаўніка або стараюцца разабрацца самастойна па вучэбным дапаможніку (65,6 % і 60,0 % адпаведна). Таксама просяць дапамогі ў аднакласнікаў (сяброў) 58,8 % апытаных, радзей — у бацькоў, родных (20,7 %). Наведваюць дадатковыя заняткі ва ўстанове адукацыі (18,6 %), займаюцца з рэпетытарам па беларускай мове (7,8 %). Аднак не лічаць патрэбным навёрстваць вучэбны матэрыял у выпадку пропускаў (знаходзяць магчымасць спісаць гатовы варыянт адказу) каля 18,9 % навучэнцаў X класа.

У працэсе даследавання вывучалася сфарміраванасць матывацыі вучэбнай дзейнасці навучэнцаў па вучэбным прадмеце «Беларуская мова». Для выяўлення накіраванасці і ўзроўню развіцця ўнутранай матывацыі навучэнцаў выкарыстоўвалася методыка дыягностыкі накіраванасці вучэбнай матывацыі Т. Д. Дубавіцкай.

Унутраныя матывы абумоўлены пазнавальнай патрэбнасцю навучэнцаў, інтарэсам да працэсу вывучэння вучэбнага прадмета і яго выніку. Дамінаванне ўнутранай матывацыі характарызуецца праяўленнем высокай пазнавальнай актыўнасці навучэнцаў у працэсе вывучэння вучэбнага прадмета. Пры ўнутранай матывацыі *атрыманне ведаў* выступае не як сродак дасягнення якіх-небудзь мэт, а як *мэта дзейнасці навучэнцаў*. Унутраная матывацыя вядзе да найлепшых вынікаў у працэсе вучэння, таму дзейнасць настаўніка па фарміраванні матываў павінна быць накіравана на развіццё пазнавальнай цікаўнасці навучэнцаў.

Знешнія станоўчыя матывы абумоўлены імкненнем асобы заняць пэўную сацыяльную пазіцыю, жаданнем атрымаць станоўчыя адзнакі і пахвалу з боку дарослых, адпавядаць чаканням бацькоў і педагогаў. Знешнія матывы характарызуюцца тым, што навучэнец дзейнічае па доўгу, абавязку. Вучоба ў многіх выпадках ажыццяўляецца дзеля прэстыжу або лідарства. Знешнія станоўчыя матывы могуць пераходзіць ва ўнутраныя і наадварот. Знешнія адмоўныя матывы заключаюцца ў пазбяганні непрыемнасцей, нежаданні вывучаць вучэбны прадмет і суправаджаюцца адмоўнымі эмоцыямі.

У выніку даследавання было выяўлена, што па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» ў большасці навучэнцаў (68,8 %) сфарміраваны ўнутраныя матывы, а ў трэці навучэнцаў (31,2 %) — знешнія матывы.

На выніка вучэбнай дзейнасці ўздзейнічае актыўнасць навучэнцаў на вучэбных занятках. Крыху больш за палову апытаных (57,1 %) указалі ў анкетах, што на вучэбных занятках па беларускай мове яны ўважліва слухаюць настаўніка, дапаўняюць, выпраўляюць адказы аднакласнікаў, актыўна ўдзельнічаюць у абмеркаванні вучэбных пытанняў і заданняў, задаюць пытанні настаўніку, калі што не зразумелі. Часам праяўляюць такую актыўнасць на ўроках 38,4 % навучэнцаў. Больш за трэць навучэнцаў (36,8 %) па-

водзяць сябе пасіўна: яны ўважліва слухаюць настаўніка, выконваюць прапанаваныя заданні, але пры гэтым не стараюцца праяўляць актыўнасці на ўроку, не перапытваюць настаўніка, калі нешта не зразумелі. Аднак ёсць і такія навучэнцы, якія прысутнічаюць на вучэбных занятках, але не ўключаюцца ў вучэбны працэс. Яны няўважліва слухаюць настаўніка і адказы аднакласнікаў, паўтараюць у гэты час вучэбны матэрыял, па якім іх могуць апытаць, займаюцца іншымі справамі. У ходзе анкетавання 5,1 % рэспандэнтаў адказалі, што на вучэбных занятках па беларускай мове яны паводзяць сябе так практычна заўсёды (19,1 % — часам).

Псіхалагічны мікраклімат на вучэбных занятках таксама аказвае ўплыў на вынікі вучэбнай дзейнасці навучэнцаў. Каля 5 % навучэнцаў указалі, што на вучэбных занятках па дадзеным вучэбным прадмеце яны часта адчуваюць дыскамфорт, няўпэўненасць, напружанасць, 30,2 % — часам. У асноўным такі стан абумоўлены адсутнасцю сітуацыі поспеху на вучэбных занятках (44,4 % адказаў навучэнцаў) і недастаткова высокімі адзнакамі па вучэбным прадмеце (37,7 %). Неабходна адзначыць, што стварэнне сітуацыі поспеху з'яўляецца ўмовай фарміравання пазітыўнай самаацэнкі, станоўчай вучэбнай матывацыі і індывідуальнага прагрэсу навучэнца ў вучэбнай дзейнасці. Нярэдка прычынай дыскамфорту на вучэбных занятках з'яўляецца адсутнасць узаемаразумення з настаўнікам (14,5 %) і напружаныя адносіны з аднакласнікамі (7,9 %).

Важным для паспяховага засваення вучэбнага матэрыялу з'яўляецца самастойнае выкананне навучэнцамі дамашніх заданняў. У ходзе апытання было выяўлена, што дамашняе заданне самастойна выконваюць заўсёды 68,6 % навучэнцаў, не заўсёды — 29,9 %. 1,5 % навучэнцаў увогуле самастойна не выконваюць дамашняе заданне. На пытанне, чаму яны не могуць самастойна справіцца з дамашнім заданнем па беларускай мове, часцей за ўсё даваўся адказ, што заданні з'яўляюцца складанымі (53,2 %). Некаторыя не ўмеюць прымяніць свае веды пры выкананні заданняў (28,4 %). Каля 22,5 % рэспандэнтаў прызналіся, што не лічаць патрэбным выконваць заданні, выкананне якіх можна спісаць у аднакласнікаў; 11,8 % не бачаць у гэтым сэнсу, паколькі настаўнік не заўсёды правярае дамашняе заданне.

Пры правядзенні РКР таксама ажыццяўлялася анкетаванне педагогаў-прадметнікаў (195 чалавек). Сярод апытаных педагогаў 46,7 % маюць вышэйшую катэгорыю, 46,7 % — першую, 3,5 % — другую і 2,1 % — без катэгорыі. Два чалавекі (1,0 %) маюць кваліфікацыйную катэгорыю «настаўнік-метадыст». У выбарцы даследавання пераважаюць педагогі з вялікім педагагічным стажам: 66,7 % працуюць настаўнікам больш за 20 гадоў, 21,0 % — 16—20 гадоў, 4,1 % — 11—15 гадоў, 3,1 % — 6—10 гадоў, 4,6 % — 1—5 гадоў, 0,5 % — менш за год.

Як паказалі вынікі апытання педагогаў, пераважная большасць з іх (99,0 %) задаволены арганізацыяй адукацыйнага працэсу па беларускай мове, магчымасцямі асабаснага і прафесійнага росту ў сваіх установах адукацыі, а таксама ўзаемаадносінамі ў педагагічным калектыве. Вынікамі сваёй педагагічнай дзейнасці задаволены 77,9 % апытаных.

У якасці фактараў, якія зніжаюць эфектыўнасць навучання беларускай мове навучэнцаў класа, у якім праводзілася РКР, большасць педагогаў адзначалі недастаткова высокую матывацыю навучэнцаў (76,4 %). Крыху больш за трэць апытаных (40 %) таксама назвалі недастатковую сфарміраванасць у навучэнцаў агульнавучэбных уменняў. Нерацыянальнае выкарыстанне часу вучэбных заняткаў адзначылі 5,6 % педагогаў. Эфектыўнасць навучання зніжаюць, па меркаванні рэспандэнтаў, вялікая затрата часу на падтрыманне дысцыпліны на вучэбных занятках і адсутнасць у педагога часу для самаадукацыі, якаснай падрыхтоўкі да вучэбных заняткаў (па 4,6 %).

Асноўныя прычыны цяжкасцей навучэнцаў X класа пры вывучэнні беларускай мовы (па меркаванні настаўнікаў) прадстаўлены ў табліцы 5.

Даныя табліцы 5 сведчаць пра тое, што ў пераліку асноўных прычын цяжкасцей навучэнцаў першымі ідуць: адсутнасць у іх уменняў рацыянальна арганізоўваць сваю вучэбную работу, лагічна выкладаць свае

думкі з выкарыстаннем прадметнай тэрміналогіі, недастаткова сфарміраванае ўменне аналізаваць, устанаўліваць прычынна-выніковыя сувязі, рабіць вывады. Указаныя прычыны цяжкасцей навучэнцаў могуць быць ліквідаваны самімі настаўнікамі ў працэсе навучання вучэбнаму прадмету.

Настаўнікі беларускай мовы хацелі б павысіць узровень сваёй прафесійнай падрыхтоўкі па наступных пытаннях:

— работа з адоранымі навучэнцамі (41,0 %);

— сучасныя тэхналогіі навучання (38,5 %);

— выкарыстанне ў адукацыйным працэсе кампанентаў ВМК па вучэбным прадмеце, уключаючы электронныя сродкі навучання (34,4 %);

— выкладанне вучэбнага прадмета на павышаным узроўні (25,6 %);

— дыягностыка індывідуальна-псіхалагічных асаблівасцей навучэнцаў (25,1 %);

— рэалізацыя кампетэнтнаснага падыходу ў выкладанні вучэбнага прадмета (19,5 %);

— работа з навучэнцамі, у якіх узнікаюць цяжкасці ў навучанні (15,4 %);

— кантрольна-ацэначная дзейнасць педагога і навучэнцаў (8,7 %).

**З улікам вышэйвыкладзенага з мэтай павышэння ўзроўню падрыхтоўкі навучэнцаў у працэсе навучання вучэбнаму прадмету «Беларуская мова» рэкамендуецца:**

***Адміністрацыі ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі:***

1. Арганізаваць у 2019/2020 навучальным годзе вывучэнне вучэбнага прадмета «Беларуская мова» з улікам рэкамендацый

**Табліца 5. — Асноўныя прычыны цяжкасцей навучэнцаў X класа пры вывучэнні вучэбнага прадмета «Беларуская мова»**

| № п/п | Прычыны цяжкасцей навучэнцаў X класа пры вывучэнні вучэбнага прадмета «Беларуская мова» | Колькасць рэспандэнтаў (%) | | |
|---|---|---|---|---|
| | | Так | Не | Цяжка адказаць |
| 1 | Недастаткова сфарміравана ўменне выкарыстоўваць чытанне як сродак навучання | 38,5 | 53,8 | 7,7 |
| 2 | Няўменне кантраляваць і ацэньваць вынікі сваёй дзейнасці | 40,5 | 52,3 | 7,2 |
| 3 | Недастаткова сфарміравана ўменне аналізаваць, устанаўліваць прычынна-выніковыя сувязі, рабіць вывады | 54,4 | 34,8 | 10,8 |
| 4 | Няўменне лагічна выкладаць свае думкі з выкарыстаннем прадметнай тэрміналогіі | 55,9 | 35,9 | 8,2 |
| 5 | Частыя пропускі вучэбных заняткаў | 32,8 | 58,5 | 8,7 |
| 6 | Адсутнасць навыкаў выкарыстання тэарэтычных ведаў пры рашэнні вучэбных задач практычнага характару | 27,7 | 50,8 | 21,5 |
| 7 | Адсутнасць навыкаў самастойнай работы з вучэбным дапаможнікам | 17,9 | 77,5 | 4,6 |
| 8 | Адсутнасць навыкаў самастойнай работы з дадатковымі крыніцамі інфармацыі па вучэбным прадмеце | 36,4 | 53,9 | 9,7 |
| 9 | Адсутнасць уменняў рацыянальна арганізоўваць сваю вучэбную работу | 58,5 | 27,7 | 13,8 |
| 10 | Недастатковая ступень сфарміраванасці ўменняў узаемадзейнічаць з аднакласнікамі, настаўнікам у працэсе вывучэння вучэбнага прадмета | 10,3 | 77,9 | 11,8 |
| 11 | Нізкая матывацыя навучэнцаў да вывучэння вучэбнага прадмета | 51,8 | 36,4 | 11,8 |

па выніках рэспубліканскай кантрольнай работы.

2. Узмацніць кантроль за арганізацыяй адукацыйнага працэсу па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» і кантрольна-ацэначнай дзейнасцю настаўнікаў беларускай мовы.

***Настаўнікам беларускай мовы і літаратуры:***

1. Дэталёва планаваць арганізацыю работы на вучэбных занятках, рацыянальна размяркоўваць час.

2. Пры падрыхтоўцы да вучэбных заняткаў і іх правядзенні кіравацца прынцыпамі дыферэнцыяцыі і індывідуалізацыі навучання; рэалізоўваць у адукацыйным працэсе дзейнасны падыход.

3. Праводзіць планамерную работу па засваенні навучэнцамі фанетычных асаблівасцей беларускай мовы, арфаэпічных, арфаграфічных, лексічных, словаўтваральных, пунктуацыйных нормаў, авалоданні імі.

Пры аналізе тэкстаў і стварэнні ўласных вусных і пісьмовых выказванняў навучэнцамі пастаянна звяртаць увагу на ўлік сферы выкарыстання, мэт, умоў зносін, адрасата, тыпу маўлення, захаванне сэнсавай сувязі частак тэксту, сказаў, раскрыццё тэмы і асноўнай думкі, ролю загалоўка.

4. Забяспечваць умовы для ўключэння ўсіх навучэнцаў у вучэбна-пазнавальную дзейнасць (у тым ліку спрыяць устанаўленню станоўчага псіхалагічнага мікраклімату).

5. Выкарыстоўваць у адукацыйным працэсе сучасныя тэхналогіі навучання, разнастайныя прыёмы зваротнай сувязі.

6. Сістэматычна праводзіць дыягностыку вучэбных дасягненняў навучэнцаў і своечасовую карэкцыю іх ведаў і ўменняў.

7. Аб’ектыўна ацэньваць вучэбныя дасягненні навучэнцаў; выкарыстоўваць на вучэбных занятках прыёмы самаацэнкі.

8. Сістэматычна праводзіць работу па паўтарэнні вывучанага раней праграмнага матэрыялу.

***Метадычным аб’яднанням настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры:***

Павысіць эфектыўнасць метадычнай работы па наступных напрамках:

— фарміраванне ў навучэнцаў станоўчай матывацыі вывучэння вучэбнага прадмета «Беларуская мова»;

— эфектыўныя метады і прыёмы фарміравання ў навучэнцаў навыкаў правільнага вуснага і пісьмовага маўлення;

— актывізацыя пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў у працэсе навучання вучэбнаму прадмету «Беларуская мова»;

— выкарыстанне сучасных тэхналогій у працэсе навучання вучэбнаму прадмету «Беларуская мова»;

— арганізацыя работы з навучэнцамі, якія маюць цяжкасці ў навучанні (своечасовае выяўленне цяжкасцей, прабелаў у ведах; выкарыстанне разнастайных падыходаў, метадаў і прыёмаў);

— прыёмы арганізацыі зваротнай сувязі, якія дазваляюць своечасова выяўляць прабелы ў ведах і ўменнях навучэнцаў;

— кантрольна-ацэначная дзейнасць педагога і навучэнцаў (крытэрыі ацэньвання настаўнікам вусных адказаў і пісьмовых работ навучэнцаў; навучанне самаацэнцы вынікаў вучэбнай дзейнасці);

— псіхолага-педагагічнае ўзаемадзеянне настаўніка і навучэнцаў (стварэнне ў класе станоўчага псіхалагічнага мікраклімату, улік узроставых і псіхалагічных асаблівасцей навучэнцаў у працэсе навучання).

***Установам павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў адукацыі:***

Уключыць у планы падрыхтоўкі настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры наступныя пытанні:

— выкарыстанне сучасных тэхналогій у працэсе навучання вучэбнаму прадмету «Беларуская мова»;

— кантрольна-ацэначная дзейнасць педагога;

— арганізацыя работы з навучэнцамі, у якіх узнікаюць цяжкасці ў навучанні;

— эфектыўныя метады і прыёмы ўдасканалення спецыяльных і агульнавучэбных уменняў навучэнцаў на вучэбных занятках па беларускай мове.

*Материалы подготовлены специалистами управления мониторинга качества образования Национального института образования*